Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

УДК [008:39(=161.3):821.161.3.091Колас](043.3)

**Вярбіцкая
Вольга Іванаўна**

# ЭТНАКУЛЬТУРНАЯ ІНТЭНЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ У ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ ЯКУБА КОЛАСА

Аўтарэферат дысертацыі на саісканне
вучонай ступені кандыдата культуралогіі

па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры

Мінск 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Работа выканана на кафедры культуралогіі УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Навуковы кіраўнік: **Шалупенка Наталля Яўгенаўна,**
кандыдат культуралогіі, дацэнт,
дэкан факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Афіцыйныя апаненты: **Марозаў Ігар Вячаслававіч,**
доктар культуралогіі, прафесар,
прафесар кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Сухоцкая Таісія Фёдараўна,**
кандыдат культуралогіі, дацэнт,
дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Апаніруючая арганізацыя: ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»

Абарона адбудзецца 14 лютага 2013 г. а 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220007, г.Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі; e-mail: buk@buk.by; тэл. вучонага сакратара 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы 27 снежня 2012 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт В.У. Мазанік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Ва ўмовах умацавання дзяржаўных, нацыянальных і культурных асноў беларускага грамадства надзвычайную актуальнасць набываюць пытанні захавання індывідуальнасці, непаўторнасці і самабытнасці нацыянальнай культуры, якая прадстаўлена разнастайнымі культурнымі тэкстамі. Беларуская класічная літаратура з’яўляецца значнай часткай культурнай спадчыны народа, яго духоўнага багацця. Яна садзейнічае захаванню нацыянальных традыцый і каштоўнасцей, выступае ў якасці дэтэрмінанты ідэнтыфікацыі нацыянальнай самасвядомасці і сацыяльнай інтэграцыі этнасаў, якія пражываюць у Беларусі.

Ля вытокаў беларускай нацыянальнай літаратуры стаяў Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч), які адыграў выключную ролю ў духоўным яднанні нацыі, абуджэнні нацыянальнай свядомасці беларускага народа. Творчая спадчына пісьменніка стала неад’емнай часткай нацыянальнага культурнага кантэксту. Неабходнасць яе навуковага вывучэння вызначаецца: узрастаючым значэннем мастацкіх сродкаў у вырашэнні гуманістычных, філасофска-быційных праблем сучаснага беларускага грамадства, а таксама рэпрэзентаваных Я.Коласам у мастацка-вобразнай форме тыповых для суб’ектаў беларускай нацыянальнай культуры падыходаў да разумення суадносін прыроды, чалавека, соцыума, актуальных вобразаў-сімвалаў, якія пабуджаюць сучаснікаў на пошукі духоўных каштоўнасцей; практычным значэннем культуратворчасці пісьменніка для сацыякультурнага развіцця сучаснага беларускага грамадства.

Прадстаўнікі беларускага і замежнага літаратуразнаўства ў працэсе даследавання мастацкай і публіцыстычнай творчасці Я.Коласа назапасілі шмат фактаграфічных матэрыялаў. Аднак у аб’ёмным бібліяграфічным паказальніку прац коласазнаўцаў адсутнічаюць комплексныя даследаванні яго спадчыны з культуралагічнага пункту гледжання. Між тым сістэмны аналіз тэкстаў літаратурных твораў пісьменніка сведчыць аб глыбокай этнакультурнай інтэнцыянальнасці ў яго творчай спадчыне, якая, на наш погляд, патрабуе комплекснага даследавання ў айчыннай тэорыі і гісторыі культуры. У дадзеным дысертацыйным даследаванні культуратворчая дзейнасць Я.Коласа разглядаецца ў святле сучасных навуковых тэорый і канцэпцый, што дазволіць адкрыць новыя перспектывы для асэнсавання беларускай літаратурнай класікі ў культуралогіі.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне праводзілася ў рамках распрацоўкі комплекснай навуковай тэмы кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” “Полімарфізм беларускай культуры як фактар дынамічнага развіцця сучаснага грамадства” (зацверджана Саветам УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, пратакол № 4 ад 21 снежня 2010 г.).

Праблематыка дадзенага даследавання сугучна Дзяржаўнай праграме “Культура Беларусі” на 2011–2015 гг. (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1905 ад 26 снежня 2010 г.). Работа адпавядае пункту 11

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

―Сацыяльна-эканамічнае і духоўна-культурнае развіццё Рэспублікі Беларусь” Пераліку прыярытэтных накірункаў навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гг. (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 красавіка 2010 г. № 585).

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта** даследавання – выяўленне ў творчасці Я.Коласа этнакультурнай інтэнцыянальнасці як крыніцы сэнсаў і ідэй, актуальных для развіцця сучаснага беларускага грамадства.

Мэта абумовіла пастаноўку і вырашэнне наступных **задач** даследавання:

– акрэсліць суаднесенасць свядомасці пісьменніка з аб’ектамі духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў;

– раскрыць сутнасць поглядаў Я.Коласа на праблему культурнай памяці ў кантэксце нацыянальна-культурнага адраджэння;

– выявіць у творчасці пісьменніка інтэнцыянальны змест працэсу інкультурацыі асобы беларуса;

– паказаць асэнсаванне Я.Коласам сялянства і інтэлігенцыі як суб’ектаў нацыянальнай культуры беларусаў;

– вызначыць у творчасці Я.Коласа рэпрэзентатыўныя аб’екты духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў.

**Аб’ект і прадмет даследавання**

**Аб’ектам** праведзенага даследавання выступае творчая спадчына Я.Коласа. **Прадметам** даследавання з’яўляецца інтэнцыянальны змест культуры беларусаў у творчай спадчыне Я.Коласа.

Выбар аб’екта і прадмета даследавання абумоўлены нераспрацаванасцю пазначанай праблемы ў культуралогіі, а таксама неабходнасцю далейшага вывучэння беларускай класікі ў культуралагічным кантэксце.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Творчая спадчына Я.Коласа з’яўляецца арганічнай часткай беларускай нацыянальнай культурнай прасторы, дзе своеасабліва рэпрэзентуюцца гістарычныя формы культурнага быцця беларускага этнасу ў пэўных прыродных і сацыяльна-палітычных умовах і ўсебакова асэнсоўваюцца тыпаўтваральныя дэтэрмінанты беларускай нацыянальнай культуры. У творах пісьменніка выразна праяўляецца сэнсаўтваральная накіраванасць свядомасці пісьменніка на сутнасць і змест культуры беларусаў. Прадметная накіраванасць мастацкай інтуіцыі, рэфлексіі, аперцэпцыі Я.Коласа сканцэнтравана на духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа, прадстаўленай вусна-паэтычнай народнай творчасцю, мовай тытульнага этнасу, этнакультурнымі архетыпамі, сімваламі, рытуаламі, абрадамі, звычаямі, традыцыямі, артэфактамі, створанымі ў працэсе культурагенезу.

2. Інтэнцыянальнае суджэнне Я.Коласа цесна звязана з праблемай культурнай памяці. Культуру беларусаў пісьменнік лічыў своеасаблівай формай памяці грамадства. У мастацкіх і публіцыстычных творах ён выявіў сутнасць, змест культурнай памяці, паказаў найбольш радыкальныя разрывы культурна-гістарычнага развіцця беларускага этнасу, якія ў сучасных наратывах трактуюцца як культурная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

траўма. Сутнасць культурнай памяці, на думку пісьменніка, заключаецца ў адлюстраванні ў вобразах мінулага сацыяльна-палітычнага і духоўнага кантэксту свайго часу, сугучнага задачам фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах дзяржаўнага і культурнага адраджэння. Памяць культуры павінна садзейнічаць фарміраванню і захаванню адметнага нацыянальнага характару і адпаведнага псіхалагічнага тыпу асобы беларуса.

Я.Колас вызначыў стратэгію дэтраўматызацыі і ўзнаўлення цэласнасці ідэнтычнасці беларускай сацыяльнай супольнасці і яе культуры. Ён прытрымліваўся ―контрапрэзентнай" стратэгіі, якая прасякнута адчуваннем недасканаласці і неправамернасці сацыякультурнай сітуацыі, што існавала ў той час, і арыентавала беларусаў на грамадска-палітычную дзейнасць за ўзнаўленне цэласнай нацыянальнай дзяржаўнасці і культуры.

Пісьменнік акрэсліў праграму нацыянальна-культурнага будаўніцтва, якая прадугледжавала: фарміраванне самасвядомасці беларусаў, шырокае выкарыстанне беларускай мовы, стварэнне нацыянальнай сістэмы адукацыі, развіццё беларускай літаратуры, тэатра, музычнага і выяўленчага мастацтва, перыядычнага друку, вывучэнне гісторыі беларускага народа, выхаванне нацыянальнай інтэлігенцыі, трансляцыю культуры беларусаў у сусветную прастору.

3. Увасабленне ідэй нацыянальна-культурнага адраджэння, на думку Я.Коласа, вымагала не проста дзяржаўнай падтрымкі культурнага жыцця, але і выпрацоўкі цэласнай праграмы сацыякультурнага развіцця, якая ўключае стварэнне нацыянальнай сістэмы фарміравання суб'екта беларускай культуры. Інкультурацыя звязана з гэтай ідэяй, таму яе інтэнцыянальны змест знайшоў адлюстраванне ў творчасці пісьменніка. Сутнасць інкультурацыіі разумелася ім як працэс засваення асобай каштоўнасцей, норм, ідэалаў, патэрнаў паводзін, выпрацаваных культурай беларусаў.

Інтуітыўнае адчуванне Я.Коласам зместу інкультурацыі дазволіла яму вылучыць яе агентаў (бацькоў, сваякоў, педагогаў, дзеячаў культуры і мастацтва), інстытуты (сям'я, навучальныя ўстановы, музеі, бібліятэкі, сродкі масавай інфармацыі), прапанаваць дзейсныя сродкі інкультурацыі (беларуская мова і літаратура, адукацыя, беларуская этнічная культура, мастацтва і інш.), абазначыць эфектыўныя спосабы перадачы культурнага досведу маладому пакаленню: вертыкальную (ад бацькоў да дзяцей), гарызантальную (у працэсе зносін з аднагодкамі), непрамую (праз інстытуты і агентаў інкультурацыі) трансмісію. Адзначаныя ідэі, выказаныя Я.Коласам, карэлююць з важнейшымі палажэннямі сучаснай культуралагічнай канцэпцыі інкультурацыі асобы.

4. Сэнсафарміруючая накіраванасць свядомасці Я.Коласа таксама была сканцэтравана вакол сялянства і інтэлігенцыі як суб'ектаў нацыянальнай культуры беларусаў. Паняцце ―беларус" у пісьменніка атаясамлівалася з вобразам селяніна, а таксама выхадцам з народа – інтэлігентам. Менавіта таму Я.Колас у сваіх розных па жанрах творах грунтоўна ўвасобіў карціну свету, каштоўнасці, асаблівыя формы і працэдуры стасункаў, мову, спецыфіку побыту сялянства і інтэлігенцыі як духоўных рэферэнтаў культуры. Культуры сялянства і інтэлігенцыі вызначаюцца адметнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знакавай сістэмай, стылем паводзін, своеасаблівай формай арганізацыі і дзейнасці, інтэнцыянальнасцю інтарэсаў, спосабамі сацыялізацыі і інкультурацыі.

Я.Колас разглядаў сялянства і інтэлігенцыю як асноўных творцаў шматслойнай культуры беларусаў, якая вызначае сэнс жыццядзеяння нацыі.

5. Рэпрэзентатыўныя аб’екты матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў (сімвалы, сэнсы, этнакультурныя архетыпы і артэфакты) выступаюць у творчасці Я.Коласа ў якасці прадмета апецэпцыі. Прасторавыя (Сонца, Зямля, Лес, Балота, Агонь, Вада, Дарога і інш.) і антрапаморфныя (Старац, Музыка і інш.) этнакультурныя архетыпы беларусаў, якія сімвалічна адлюстроўваюць сацыяльныя адносіны, каштоўнасці (свабода, справядлівасць, памяркоўнасць, жыццядайны пачатак), персаніфікуюць лёс народа, творцаў культуры, носьбітаў народнай мудрасці, паўстаюць у розных сацыякультурных функцыях і стасунках.

Праз мастацкае ўзнаўленне сэнсаў і сімвалаў (дабро, зло, жыццё, смерць, прыгажосць, радзіма і інш.) рознажанравага беларускага фальклору Я.Колас акрэсліваў семіятычнае поле духоўнай культуры беларускага народа. Інтэнцыянальны змест выкарыстаных пісьменнікам у працэсе культуратворчасці вобразаў аўтэнтычных прадметных форм беларускай культуры (жыллё, гаспадарчыя і грамадзянскія пабудовы, адзенне, ежа і інш.) выступае як код у структуры культуры беларусаў, своеасаблівы культурны тэкст.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Работа з’яўляецца вынікам уласных навуковых пошукаў дысертанта, грунтуецца на метадалагічных падыходах да аналізу літаратуры як тэксту культуры і складанага інтэртэкстуальнага феномена. Гэта першае ў айчыннай і замежнай гуманітарыстыцы комплекснае культуралагічнае даследаванне зместу літаратурных тэкстаў Я.Коласа.

Творчая спадчына Я.Коласа ўпершыню разглядаецца як прастора, сатканая з сэнсавобразаў розных пластоў духоўнай і матэрыяльнай культуры; мастацкія і публіцыстычныя творы пісьменніка прадстаўлены як крыніцы культуралагічнай інфармацыі аб аб’ектах, суб’ектах, з’явах і працэсах беларускай культуры на розных этапах яе развіцця; выяўлена змястоўная і спецыфічная для культуратворчасці Я.Коласа праграма нацыянальна-культурнага адраджэння; паказаны мастацка-творчыя, публіцыстычныя, навукова-педагагічныя і грамадзянскія намаганні пісьменніка ў галіне культурна-дзяржаўнага будаўніцтва, узнаўлення ў свядомасці беларусаў культурнай памяці, выкарыстання ―контрапрэзентнай” стратэгіі ў мэтах пераадолення культурнай траўмы беларускага этнасу; абгрунтавана выснова аб тым, што творчая спадчына Я.Коласа – гэта своеасаблівы генератар культуралагічных ведаў, дзе выяўлены ідэі, сугучныя канцэпцыі інкультурацыі, вызначаны дамінантныя кампаненты культур інтэлігенцыі і сялянства; выкарыстана і апрабавана існуючая метадалогія культуралагічнага аналізу літаратурнага тэксту, створана грунтоўная крыніцазнаўчая база даследавання.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі даследавання апрабаваны ў публікацыях і выступленнях на 14 навуковых канферэнцыях міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўню. Сярод іх:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навуковая канферэнцыя “90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею” (30–31 кастрычніка 2008 г., г. Віцебск); III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання” (29–30 красавіка 2009 г., г. Мінск); IV Міжнародная навуковая канферэнцыя “Культура, наука, образование в современном мире” (14–15 мая 2009 г., г. Гродна); VII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Зберігання історіко-культурної спадщіні” (22–24 верасня 2009 г., г. Кіеў); Другія Тышкевіцкія чытанні (15 кастрычніка 2009 г., г. Лагойск); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Народы, культуры и социальные процессы на пограничье” (22–23 лютага 2010 г., г. Гродна); Міжнародная навуковая канферэнцыя “Актуальные проблемы мировой художественной культуры” (25–26 сакавіка 2010 г., г. Гродна); XVI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (26–28 мая 2010 г., г. Мінск); навуковая канферэнцыя “Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі” (3 снежня 2010 г., г. Мінск); III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Фальклор і сучасная культура” (да 90-годдзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта) (21–22 красавіка 2011 г., г. Мінск); Міжнародная навуковая канферэнцыя “Каралеўскія і велікакняжацкія замкі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай” (22–23 верасня 2011 г., г. Гродна); XXVI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Якуб Колас і яго сучаснікі: да вывучэння творчага і асабістага кола ўзаемасувязей пісьменніка” (4 лістапада 2011 г., г. Мінск); VII Міжнародная навуковая канферэнцыя “Мова – літаратура – культура” (27–28 верасня 2012 г., г. Мінск); XXVII Міжнародная навуковая канферэнцыя “Якуб Колас. Чалавек. Эпоха. Час” (2–3 лістапада 2012 г., г. Мінск).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Змест дысертацыі і асноўныя вынікі поўнасцю адлюстраваны ў 14 публікацыях: 5 артыкулах у рэцэнзаваных навуковых часопісах (1,8 аўтарскага аркуша), 1 артыкуле ў навуковым зборніку, 8 матэрыялах навуковых канферэнцый. Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 5,3 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса. Агульны аб’ём дысертацыі – 139 старонак, з іх 108 старонак – асноўны тэкст, 31 старонка – бібліяграфічны спіс, які складаецца са спісу выкарыстаных крыніц (374 найменні на беларускай, рускай, украінскай, польскай, англійскай, нямецкай, французскай мовах) і спісу публікацый саіскальніка (14 найменняў на беларускай і рускай мовах).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

*У **першай главе*** **“Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання”** разглядаюцца асноўныя крыніцы, якія склалі тэарэтычную базу работы, а таксама раскрываюцца метадалогія і метады, што выкарыстоўваліся дысертантам у працэсе даследавання этнакультурнай інтэнцыянальнасці ў коласаўскай творчай спадчыне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*У раздзеле 1.1* ***“Аналітычны агляд літаратуры па даследуемай праблеме”*** робіцца аналіз ступені даследаванасці творчай спадчыны Я.Коласа ў беларускай і замежнай гуманітарыстыцы, падаецца агляд прац па розных аспектах творчасці пісьменніка. Адзначаецца, што наватарская творчасць Я.Коласа, адметная глыбінёй пранікнення ў духоўны свет чалавека, была аб’ектам увагі даследчыкаў ужо ў першыя дзесяцігоддзі ХХ ст. Асаблівасці праблематыкі, мастацкага стылю, паэтыкі, сюжэту, кампазіцыі, мовы коласаўскіх твораў аналізаваліся А.Бабарэкам, М.Багдановічам, Г.Базыленкам, М.Байковым, П.Бузуком, А.Бульбай, Ю.Бярозкам, А.Вазнясенскім, Ю.Дрэйзіным, У.Дзяржынскім, М.Гарэцкім, І.Замоціным, Я.Карскім, А.Лёсікам, М.Піятуховічам, Р.Шушкевіч-Трацціяковым і інш. Галоўную ўвагу даследчыкі звярталі на рэвалюцыйнасць твораў, іх дэтэрмінаванасць грамадска-палітычнымі працэсамі. Шэраг навуковых прац, у якіх разглядалася літаратурная дзейнасць Я.Коласа, з’явіліся ў Расіі, Украіне, Польшчы, Чэхіі. Мастацкая творчая дзейнасць, майстэрства мастака слова высока ацэньвалася ў артыкулах Л.Васілеўскага, С.Вянгерава, М.Горкага, М.Ісакоўскага, С.Русавай, М.Рыльскага, П.Тычыны, І.Свянціцкага, А.Чэрнага і інш.

Навуковыя даследаванні літаратурнай, навуковай і грамадскай дзейнасці Я.Коласа актывізаваліся ў пасляваенны перыяд. У гэты час з’яўляецца шэраг калектыўных фундаментальных прац, аўтарскіх манаграфій і навукова каментаваных выданняў (А.Адамовіча, А.Лойкі, І.Навуменкі, Ю.Пшыркова), у якіх аналізуюцца месца і значэнне творчай спадчыны Я.Коласа ў беларускай літаратуры, творчасць пісьменніка разгледжана на фоне глабальных гістарычных падзей ХХ ст. і ў непасрэднай сувязі з агульнаеўрапейскім літаратурным працэсам. Прыклады творчага засваення новых традыцый у галіне даследавання коласаўскай мастацкай спадчыны паказалі У.Агіевіч, М.Барсток, В.Каваленка, М.Лужанін, А.Налівайка, А.Семяновіч, Л.Фіглоўская і інш. Адыйсці ад сацыяльнасці, палітызаванасці, адшукаць тое, што надае мастацкім творам Я.Коласа непаўторнасць, імкнуліся ў сваіх працах Д.Гальмакоў, В.Казбярук, Я.Клімуць, М.Мушынскі, В.Рагойша, М.Ярош і інш.

З 90-х гадоў ХХ ст. пачаўся якасна новы этап у развіцці коласазнаўства. Працэс станаўлення і ўмацавання дзяржаўных, нацыянальных і культурных асноў беларускай супольнасці, самаідэнтыфікацыя і ўваходжанне беларусаў у шматвектарную сусветную культурную прастору запатрабавалі новага прачытання літаратурнай спадчыны Я.Коласа. Грунтоўнымі, аналітычнымі, па-сапраўднаму наватарскімі з’яўляюцца даследаванні У.Гніламёдава, В.Жураўлёва, В.Максімовіча, М.Тычыны, Т.Шамякінай, у якіх сцвярджаецца, што творы Я. Коласа прасякнуты імкненнем цэласнага, шматмернага, універсальнага ахопу жыцця.

Стылёва-жанравыя асаблівасці прозы і паэзіі Я.Коласа ў гэты перыяд даследавалі Т.Дасаева, А.Манкевіч, Л.Сінькова, У.Славецкі, Т.Сухоцкая. Антрапапрыродны напрамак ў творчасці пісьменніка вывучалі П.Кошман, Ж.Шаладонава, А.Шамякіна. Тэарэтычныя лінгвістычныя погляды і моўная практычная дзейнасць пісьменніка паказаны Ю.Бабіч, Ж.Белакурскай, Ю.Назаранкам і інш. Аднак нягледзячы на вялікую колькасць навуковых прац, прысвечаных аналізу разнастайных аспектаў мастацкай творчасці Я.Коласа, прыходзіцца канстатаваць, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчая спадчына пісьменніка даследуецца і вывучаецца ў асноўным са спецыфічнага літаратуразнаўчага і мовазнаўчага пунктаў гледжання, яна амаль не ўключана ў культуралагічны кантэкст, хоць у ёй рэпрэзентаваны розныя аб'екты духоўнай і матэрыяльнай культуры, значныя ў дачыненні да беларускай нацыянальнай культуры, да мэтаў і перспектыў яе развіцця на сучасным этапе. У беларускім коласазнаўстве маюцца толькі асобныя спробы выяўлення філасофскіх, эстэтычных і сацыяльных мадэлей свету, якія паўстаюць у эпічных творах пісьменніка (В.Белакурскі, А.Бельскі, Я.Гараднiцкі, Н.Капшай, У.Конан, А.Майхровіч, І.Шаладонаў, А.Яскевіч).

У пачатку XXI ст. да творчай спадчыны Я.Коласа пачынаюць звяртацца і беларускія культуролагі. На старонках навуковых выданняў з'яўляюцца працы, у якіх з культуралагічных пазіцый закранаюцца асобныя праблемы культуратворчай дзейнасці пісьменніка: Л.Кажухоўскай (міфалагемы), Л.Кухто (дзіцячая субкультура), І.Марозава (архетыповыя вобразы), А.Смоліка (вясковая культура), Т.Сухоцкай (традыцыйная культура). Метадалагічную каштоўнасць для нас таксама ўяўляе навуковая праца беларускага культуролага П.Банцэвіча, дзе літаратурная творчасць У.Караткевіча даследуецца ў культуралагічным кантэксце. Але трэба адзначыць, што комплекснае культуралагічнае даследаванне творчай спадчыны Я.Коласа адсутнічае ў тэорыі і гісторыі культуры, што з'яўлецца пацвярджэннем актуальнасці прадстаўленай дысертацыіі.

У той жа час у замежнай гуманітарыстыцы маецца значная колькасць прац фундаментальнага тэарэтыка-метадалагічнага характару на сумежжы філалогіі і культуралогіі, абапіраючыся на якія можна грунтоўна даследаваць літаратурную спадчыну класікаў беларускай літаратуры з пазіцыі культуралагічнага падыходу. Сярод іх можна вылучыць даследаванні прадстаўнікоў: фенаменалогіі культуры (Э.Гусерль, М.Мерло-Панці, Ж-П.Сартр); структуралізму і постструктуралізму (Ж.Бадрыяр, Р.Барт, Ж.Дэрыда, Ю.Крысцева, Ж.Лакан, К.Леві-Строс); герменеўтыкі (Г.Гадамер, В.Дзільтэй, П.Рыкёр); семіётыкі культуры (Ю.Лотман, Ч.Пірс); інтуітывізму (Н.Бергсан, М.Бярдзяеў, Б.Крочэ) і інш.

*У раздзеле 1.2* ***"Метадалогія і метады даследавання"*** выкладаецца агульная канцэпцыя працы, вызначаюцца асноўныя падыходы і метады даследавання абазначанай праблемы. Аснову агульнай канцэпцыіі даследавання складае тэзіс аб наяўнасці этнакультурнай інтэнцыянальнасці ў творчасці Я.Коласа, якая разглядаецца намі як накіраванасць свядомасці Я.Коласа на асэнсаванне з'яў і працэсаў нацыянальнай культуры беларусаў і якая вызначаецца прадметным зместам асэнсавання: 1) культурнай памяці ў кантэксце нацыянальна-культурнага адраджэння; 2) працэсу інкультурацыі асобы беларуса; 3) культур сялянства і інтэлігенцыіі; 4) аб'ектаў духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў. Зыходзячы з вызначаных прадметных напрамкаў рэфлексіі Я.Коласа і пабудавана канцэпцыя дадзенага даследавання.

Адзначаецца, што прадмет даследавання абумовіў выкарыстанне фенаменалагічнага падыходу як аднаго з асноўных, прадстаўленага ў працах Ф.Брэнтана, Э.Гусерля, М.Мерло-Панці, Ж.-П.Сартра і інш. Цэнтральнай катэгорыяй фенаменалогіі з'яўляецца інтэнцыянальнасць, якая трактуецца ў Э.Гусерля як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фундаментальная ўласцівасць свядомасці – быць свядомасцю аб нечым, як накіраванасць свядомасці на прадмет, якая канстытуіруецца ў сэнсах і значэннях. Да прадметных актаў свядомасці Э.Гусерль адносіць успрыманне, рэфлексію, успаміны, формы мыслення і інш. М.Мерло-Панці пашырае дадзенае Э.Гусерлем паняцце і разглядае інтэнцыянальнасць не толькі як уласцівасць актаў свядомасці, а як фундаментальныя адносіны чалавека да свету. Аналіз асобных аспектаў інтэнцыянальнасці ўтрымліваецца таксама ў тэарэтыка-метадалагічных працах беларускіх філосафаў У.Конана, М.Мажэйкі, А.Філіповіча, якія інтэрпрэтуюць інтэнцыянальнасць як імкненне, увагу суб'екта культуры да пэўных працэсаў і з'яў рэчаіснасці.

Міждысцыплінарны характар праблемы дысертацыйнага даследавання абумовіў неабходнасць комплекснага падыходу да выяўлення этнакультурнай інтэнцыянальнасці ў творчасці Я.Коласа. Тэарэтычную базу даследавання складаюць канцэптуальныя палажэнні фенаменалогіі культуры, герменеўтыкі, семіётыкі, структуралізму, постструктуралізму, культурнага рэлятывізму, псіхааналізу. Асноўнымі метадамі, з дапамогай якіх вызначалася сістэма поглядаў Я.Коласа на сацыякультурны спектр праблем, выяўляліся яго культуралагічныя рэфлексіі, былі: гісторыка-культурнай рэканструкцыі, генетычны, біяграфічны, кампаратыўны, кантэнт-аналіз.

У ***другой главе*** **"Культуралагічная інтэнцыя творчасці Я.Коласа"** паказваецца суаднесенасць свядомасці пісьменніка з каштоўнасцямі і ідэаламі нацыянальнай культуры беларусаў, карэляцыя яго ідэй і поглядаў з сутнасцю і зместам пэўных культуралагічных тэорый.

*У раздзеле 2.1* ***"Асэнсаванне Я.Коласам праблемы культурнай памяці ў кантэксце нацыянальна-культурнага адраджэння"*** разглядаюцца асаблівасці суб'ектна-творчага асэнсавання пісьменнікам дынамікі беларускай нацыянальнай культуры. Адзначаецца, што фундаментальным каталізатарам культурных змен у канцы XIX—пачатку XX ст. Я.Колас лічыў беларускае адраджэнне, шчырым прыхільнікам якога быў сам. У паэмах „Сымон-музыка”, „Рыбакова хата”, трылогіі „На ростанях”, аповесці „На прасторах жыцця”, публіцыстычных артыкулах „Васемнаццатая гадавіна”, „Вялікія грандыёзныя задачы”, „Двадцать пять”, „Думкі да дваццацігоддзя БССР” і іншых творах выяўляюцца погляды пісьменніка на змест і сутнасць нацыянальна-культурнага адраджэння ў Беларусі. Ён вызначыў яе праграму, якая прадугледжвала: фарміраванне свядомасці беларусаў, шырокае бытаванне беларускай мовы, стварэнне шматузроўневай нацыянальнай сістэмы адукацыі, беларускага прафесійнага мастацтва, перыядычнага друку, вывучэнне гісторыі беларускага народа, выхаванне нацыянальнай інтэлігенцыі, трансляцыю культуры беларусаў у сусветную прастору.

Значнае месца ў творчасці Я.Коласа займае інтэрпрэтацыя такой культуралагічнай катэгорыі, як культурная памяць, хоць гэты тэрмін ён не канцэптуалізаваў у сваіх працах. Выказванні пісьменніка па гэтай праблеме сугучны ідэям парадыгмы памяці культуры, прадстаўнікамі якой з'яўляюцца Я.Асман, П.Бёрк, Ю.Лотман, Дж.Олік, П.Рыкёр, М.Хальбвакс, П.Хаттан і інш. Культуру пісьменнік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разумеў як своеасаблівую форму памяці грамадства, якая ў вобразах мінулага так альбо інакш адлюстроўвае сацыяльна-палітычны і духоўны кантэкст свайго часу. Культурная памяць, на яго думку, павінна садзейнічаць фаміраванню і падтрыманню адметнага нацыянальнага характару і адпаведнага псіхалагічнага тыпу асобы. Узнаўленне і замацаванне ў свядомасці беларускага этнасу багатых культурных здабыткаў вызначаюцца і як дамінанты творчасці пісьменніка. Паводле Я.Коласа, культурная памяць уключае ў сябе абгрунтаваныя ўспаміны, веды аб гісторыі нацыянальнай культуры. Таму ў тканіне коласаўскіх тэкстаў (―Новая зямля”, ―Сымон-музыка”, ―На ростанях”) маецца шмат гістарычных паданняў, легенд, фальклорных твораў. Яго публіцыстыка пранізана гістарызмам, бо пісьменнік імкнуўся ўзнавіць у памяці беларусаў важнейшыя этапы іх культурна-гістарычнага развіцця (артыкулы ―Совместная борьба русского и белорусского народов против немецкой агрессии”, ―Над чым мы працуем”, “За паўтара дзесятка гадоў” і інш.).

У калектыўным вобразе мінулага вылучаюцца ―перыяды-ўзлёты” і ―пустыя гістарычныя перыяды”. У якасці ―вяршынь” культурнага развіцця пісьменнік вылучаў перыяд існавання Полацкага, Віцебскага і іншых старажытных княстваў, эпоху Вялікага Княства Літоўскага і савецкі перыяд. На гэтых гістарычных этапах, на яго думку, беларускі народ стварыў сваю дзяржаўнасць, забяспечыў поўную незалежнасць, буйны росквіт роднага слова і культуры. ―Пустым” гістарычным этапам, па меркаванні Я.Коласа, з’яўляецца XIX стагоддзе, калі беларускія землі знаходзіліся ў складзе Расійскай Імперыі. Культурнае развіццё беларусаў стрымлівалі таксама знаходжанне Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921–1939 гг.) і акупацыя тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі (1941–1944 гг.). У шэрагу публіцыстычных і мастацкіх твораў пісьменніка ў памяці беларусаў узнаўляліся найбольш радыкальныя разрывы іх культурна-гістарычнага развіцця – так званыя культурныя траўмы, якія мелі негатыўнае ўздзеянне, пагражалі існаванню беларускага грамадства і былі разбуральныя для яго фундаментальных культурных асноў. Аднак Я.Колас не абмяжоўваўся толькі паказам культурнай траўмы, але і спрабаваў вызначыць стратэгію дэтраўматызацыі і ўзнаўлення цэласнасці ідэнтычнасці беларускай сацыяльнай супольнасці. Ён прытрымліваўся ―контрапрэзентнай” стратэгіі, якая арыентавала беларусаў на актыўную дзейнасць за ўзнаўленне цэласнай нацыянальнай дзяржаўнасці і культуры. Для Я.Коласа была непрымальнай ―абгрунтоўваючая” стратэгія, паколькі яна апраўдвала існуючы парадак рэчаў і заклікала да пакоры і прагматызму.

Паводле Я.Коласа, фарміраванне, захаванне і трансляцыя культурнай памяці немагчымы без наяўнасці яе духоўнага рэферэнта – інтэлігенцыі. Пісьменнік пастаянна акцэнтаваў увагу літаратараў, кампазітараў, вучоных на неабходнасці збіраць, апрацоўваць і даносіць да сучаснага пакалення культурна-гістарычную спадчыну беларускага народа, ствараць змястоўныя падручнікі па гісторыі, літаратуры, ладзіць экспазіцыі ў музеях, экскурсіі да помнікаў гісторыі і культуры.

*У раздзеле 2.2* ***“Інкультурацыя асобы беларуса як прадмет інтэнцыянальнасці ў творчай спадчыне Я.Коласа”*** выяўляецца сэнсаўтваральная накіраванасць свядомасці і дзейнасці пісьменніка на працэс далучэння асобы да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай нацыянальнай культуры. Аналіз яго навуковай працы “Методыка роднай мовы”, кнігі “Другое чытанне для дзяцей беларусаў”, шэрага публіцыстычных і мастацкіх твораў сведчыць, што ў іх выказаны многія навукова абгрунтаваныя пытанні, сугучныя канцэпцыіі інкультурацыі асобы. Сам тэрмін “інкультурацыя” ў творах Я.Коласа не ўжываецца. Пісьменнік выкарыстоўвае такія паняцці, як “асвета”, “адукацыя”, “выхаванне”, якія сучаснымі культуролагамі трактуюцца як асноўныя складовыя часткі працэсу інкультурацыі.

На думку пісьменніка, творчае асобаснае асэнсаванне культуры індывідам пачынаецца ў сям’і, якую ён разглядаў як мікраасяроддзе, дзе адбываецца трансмісія культуры. Па яго меркаванні, менавіта ў сям’і закладваецца падмурак агульнагуманістычных маральных якасцей, культуры роднай мовы, сацыякультурнай камунікацыі. Дзейнасць сям’і па фарміраванні этнакультурных каштоўнасцей, норм і ідэалаў знайшла шырокае адлюстраванне ў паэмах “Новая зямля”, “Рыбакова хата”, трылогіі “На ростанях”, аповесці “Дрыгва”, апавяданнях “Малады дубок”, “Сірата Юрка”, “На чыгунцы”, “Пад Новы год” і інш.

У творах Я.Коласа грунтоўна раскрыты працэс інкультурацыі асобы ў перыяд сталення, калі індывід фарміруе і развівае ўласную карціну свету ў дыялогу з суб’ектамі сваёй нацыянальнай культуры і іншых культур. Вялікую ролю ў працэсе інкультурацыі на гэтым этапе пісьменнік адводзіў адукацыі. Свае погляды на месца і ролю адукацыі, змест і метады дзейнасці школы ён акрэсліў у грунтоўнай навуковай працы “Методыка роднай мовы”, артыкулах “Слуцкія курсы”, “Школа і дзяржаўнае будаўніцтва”, “Нашы савецкія дзеці”, “Задачы савецкай школы”, трылогіі “На ростанях”, апавяданні “Туды, на Нёман” і інш. У коласаўскіх поглядах на інкультурацыю падаецца навукова-тэарэтычнае абгрунтаванне ролі і месца сацыяльных інстытутаў і агентаў інкультурацыі. Агентамі, паводле Я.Коласа, былі: бацькі, сваякі, педагогі, дзеячы культуры і мастацтва. Галоўнымі інстытутамі інкультурацыі ён лічыў сям’ю, навучальныя ўстановы, сродкі масавай інфармацыі, бібліятэкі, музеі, тэатры. Асноўнае іх прызначэнне – духоўная вытворчасць, трансляцыя культуры, фарміраванне высокіх духоўных патрэб, стварэнне ўмоў для выяўлення і рэалізацыі творчых здольнасцей асобы. У шэрагу публіцыстычных артыкулаў Я.Колас засяроджвае ўвагу грамадскасці на неабходнасці выкарыстання мастацтва і літаратуры як магутных сродкаў уплыву, умацавання і ўкаранення ідэй у свядомасць мас. Ён прааналізаваў гісторыю станаўлення і развіцця беларускага нацыянальнага мастацтва, паказаў яго значэнне ў фарміраванні духоўных каштоўнасцей, эстэтычнага густу моладзі, у далучэнні яе да свету прыгажосці.

Цэнтральнае месца ў працэсе інкультурацыі, па меркаванні пісьменніка, займае родная мова. Яна выступае як фактар найлепшага развіцця асобы, важнейшая ўмова яе гарманічнага існавання. У артыкулах “З поваду майго юбілею”, “Литературная учеба”, “Мова М. Лынькова па раману “На чырвоных лядах”, “Шануйце і любіце сваю родную мову”, “Развіваць і ўзбагачаць літаратурную мову” лейтматывам праходзіць думка аб тым, што без роднай мовы адбываецца дэградацыя асобы і грамадства, занядбанне іх інтэлектуальнага, творчага, маральнага патэнцыялу. Я.Колас у гэтых артыкулах таксама сцвярджаў, што этнічная культура з’яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўстойлівай часткай нацыянальнай культуры, дзякуючы якой адбываюцца назапашванне і трансляцыя народнага вопыту асобай. На яго думку, засваенне вуснай народнай творчасці народа – першасная ўмова гарманічнага існавання асобы.

Такім чынам, інтэнцыянальны змест працэсу інкультурацыі ў творах пісьменніка сведчыць, што Я.Колас ясна разумеў сэнс, характар інкультурацыі і яе значэнне для грамадства. Паэт вызначыў месца этнічнай культуры, роднай мовы, прафесійнага мастацтва, ролі асноўных агентаў і сацыяльных інстытутаў у працэсе фарміравання асобы. Ён быў перакананы, што інкультурацыя садзейнічае абнаўленню і напаўненню нацыянальнай культуры новым сэнсам і зместам, якія арыентуюць асобу на маральнае самаўдасканаленне і актывізацыю культуратворчасці, што набывае актуальнасць для сучаснасці.

*У раздзеле 2.3* ***“Накіраванасць рэфлексіі Я.Коласа на сялянства і інтэлігенцыю як суб’ектаў нацыянальнай культуры беларусаў”*** прадметам даследавання выступаюць культуры сялянства і інтэлігенцыі, якія ўвасоблены ў творчасці пісьменніка. Пры гэтым пісьменнік не звужае культурагенез да сялянскага аспекту, а разглядае культурна-гістарычны працэс у шырокім сэнсе. У трылогіі “На ростанях”, паэме “Сымон-музыка”, аповесці “На прасторах жыцця”, апавяданні “Туды, на Нёман” і інш., у шэрагу публіцыстычных твораў Я.Колас сцвярджае дамінуючую ролю культуры беларускай інтэлігенцыі, сутнасць і змест якой ён найбольш грунтоўна раскрыў на прыкладзе самай шырокай і дэмакратычнай яе праслойкі – настаўніцтва і дзеячаў мастацкай культуры. Дамінантай уяўленняў носьбітаў культуры інтэлігенцыі, на яго думку, з’яўляецца комплекс каштоўнасных арыентацый і рэгулятараў. У якасці базавых пісьменнік вылучаў веды, на аснове якіх фарміруецца светапогляд і карціна свету інтэлігенцыі. Ён акрэсліваў інтэлігенцыю двума патрабаваннямі: яна павінна мець імкненне да ведаў і павінна несці свае веды ў народ, выводзіць яго на шлях прагрэсу, культуры і маральнага ўдасканалення. Да важнейшых складнікаў культуры інтэлігенцыі пісьменнік адносіў таксама свабоду, высокія маральныя, духоўныя якасці, якія праяўляюцца ў канкрэтных справах. Інтэлігентам, сцвярджаў Я.Колас, уласціва такая маральная каштоўнасць, як самаахвяраванне. Праз мастацкія вобразы, створаныя ў паэтычных і празаічных творах, ён раскрывае такі складнік маралі інтэлігенцыі, як сумленне. Галоўнай місіяй інтэлігенцыі, на погляд пісьменніка, з’яўляецца духоўная перабудова беларускага грамадства. Я.Колас быў перакананы, што без нацыянальнай інтэлігенцыі – носьбіта ведаў, маральнай свядомасці, справядлівасці – немагчыма адбудаваць сваю дзяржаўнасць і культуру.

Але паняцце “беларус” у Я.Коласа ў першую чаргу атаясамлівалася з вобразам селяніна. У сваіх творах розных жанраў (паэмах “Новая зямля”, “Рыбакова хата”, аповесцях “Дрыгва”, “Адшчапенец” і інш.) пісьменнік імкнуўся перш за ўсё ўвасобіць ідэалы селяніна, яго каштоўнасці, этас, думкі. Я.Колас зыходзіць з таго, што беларускі селянін меў своеасаблівую карціну свету, першароднае, міфапаэтычнае, рэлігійнае светаўспрыманне. Глыбінна-адухоўленую, рэлігійна-сакральную сувязь селяніна з сусветам аўтар паказаў у “Казках жыцця”, паэмах “Сымон-музыка”, “Новая зямля”, вершах, якія ўвайшлі ў зборнік “Песні-жальбы” і інш. Да важнейшых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасцей сялянскай культуры Я.Колас адносіць працу і свабоду. Зямля і свабода для селяніна, лічыць ён, цесна звязаны паміж сабой. Неад’емнай каштоўнасцю сялянскай культуры з’яўляюцца таксама цярпенне і спрадвечная цягавітасць, што абумовілі вытокі гістарычнага народнага аптымізму. Па меркаванні Я.Коласа, сялянская культура грунтуецца на шматвяковай маралі, этыцы, якімі кіруюцца вяскоўцы ў сваім паўсядзённым жыцці. Я.Колас імкнуўся засяродзіць увагу на душэўнай дабрыні народа, на ўласцівым яму пачуцці справядлівасці, на яго імкненні да шчасця.

Такім чынам, Я.Колас меркаваў, што культуры сялянства і інтэлігенцыі з’яўляюцца важнейшым складнікам нацыянальнай культуры беларусаў, у якой увасоблены ідэалы, каштоўнасці, сэнсы і інш.

У ***трэцяй главе*** **“Аперцэпцыя Я.Коласам з’яў і працэсаў нацыянальнай культуры беларусаў”** разглядаецца ўспрыманне пісьменнікам культурных форм, базісных элементаў культуры, якія фарміруюць мадэлі жыцця беларускага этнасу.

*У раздзеле 3.1* ***“Этнакультурныя архетыпы і іх пераасэнсаванне ў творчасці Я.Коласа”*** акрэсліваюцца асноўныя канстанты духоўнасці беларусаў, якія найбольш поўна ўвасоблены ў літаратурных тэкстах. Мастацкая творчасць Я.Коласа нараджалася на аснове этычных і эстэтычных уяўленняў беларускага народа, свядомасць якога па сваёй сутнасці была міфалагічнай. Міфалогія і фальклор, якія фарміруюць архетыпы этнічнай свядомасці, сталі для пісьменніка арсеналам універсальных філасофскіх рэфлексій. Аналіз семантыкі коласаўскіх вобразаў з пазіцый архетыповай канцэпцыі Юнга дазволіў рэканструяваць старажытны сэнс этнакультурных архетыпаў і адначасова знайсці асабіста аўтарскае напаўненне пэўных вобразаў-архетыпаў. Аналіз літаратурных твораў Я.Коласа паказвае, што найбольш глыбока ім пераасэнсаваны архетыпы Зямлі, Сонца, Вады, Агню, Дрэва, Леса, Балота, Дарогі, Музыкі, Старца.

Прасторавыя архетыпы ў творчай спадчыне Я.Коласа (паэме ―Новая зямля”, трылогіі ―На ростанях”, аповесці ―Дрыгва”, навелах ―Казкі жыцця”) маюць высокі семіятычны статус. Сонца, Зямля, Лес, Балота, Дарога выконваюць у яго творчасці разнастайныя сацыякультурныя функцыі і разглядаюцца як найвышэйшае ўвасабленне Космасу, ідэальнае ўпарадкаванне свету. Правобразам прыроднага свету з’яўляецца архетыповы вобраз лесу, які займае ў беларускім Космасе важнейшае месца. З вобразам леса пісьменнік звязваў уласную філасофію жыцця, гарманізуючы пачатак свету. Архетыпы агню, вады ў ―Казках жыцця” маюць філасофскую напоўненасць. Пазначаныя архетыповыя вобразы ён уключыў у працэс філасофскіх разваг аб існым. Жывая вада ў творах становіцца сімвалам культурнага адраджэння Беларусі. Праз архетыповыя вобразы ў алегарычнай форме Я.Колас імкнуўся выказаць маральна-этычныя ісціны, што нараджаліся ў перыяд станаўлення беларускай дзяржаўнасці, нацыянальнай культуры. Культуралагічны падыход да паэтычных і празаічных твораў Я.Коласа паказаў, што архетып дарогі выкарыстоўваўся як сродак духоўнага фарміравання і самасцвярджэння суб’екта культуры, адлюстроўваў пошук сэнсу жыцця і шчасця, а таксама небяспеку, неабароненасць перад лёсам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз паэтычных і празаічных твораў Я. Коласа дазволіў нам выявіць узмоцнены мастаком этнакультурны архетыповы вобраз Старца, характэрны для беларускай традыцыйнай культуры. З дапамогай гэтага вобраза пісьменнік раскрыў асноўныя псіхалагічныя рысы беларуса – памяркоўнасць, кемлівасць, разважлівасць, асцярожнасць, дасціпнасць, народную мудрасць. У паэмах ―Сымон-музыка”, ―Новая зямля”, ―Рыбакова хата”, аповесці ―Дрыгва”, апавяданнях ―Крывавы пір”, ―Збоку жыцця” і інш. Я.Колас надзяляў беларуса цвярозым прыродным розумам, адлюстроўваў чалавекам, у якога ёсць свая філасофія, светаразуменне, свае прынцыпы. У творах пісьменніка прысутнічае і архетып Музыкі як суб’екта нацыянальнай культуры, які паступова становіцца грамадскім дзеячам, выразнікам ідэй нацыянальна-культурнага адраджэння. У коласаўскіх мастацкіх творах Музыка – гэта ідэал беларускага адраджэння, сімвалічнае ўвасабленне творчай інтэлігенцыі. У алегарычнай навеле ―Дудар” і паэме ―Сымон-музыка” выразна праяўляецца коласаўская канцэпцыя мастацтва, згодна з якой сапраўднае мастацтва ствараецца свабоднай асобай і служыць народу. Паэт прыходзіць да высновы, што мастацтва пазітыўна ўплывае на сацыяльныя працэсы, аказвае велізарнае магічнае ўздзеянне на людзей. Яно далучае людзей да найвялікшай гармоніі, суладнасці, прыгажосці, выклікае жаданне пазбавіцца ад тых перашкод, якія затрымліваюць развіццё грамадства.

*У раздзеле 3.2* ***“Узнаўленне глыбінных сэнсаў і сімвалаў беларускага фальклору ў творчасці Я.Коласа”*** вызначаюцца сэнсы і сімвалы розных жанраў фальклору, якія пісьменнік выкарыстоўваў у мастацка-творчай практыцы. Ён сцвярджаў, што менавіта ў традыцыйнай вуснай паэтычнай творчасці адбываецца арыентацыя асобы на культурныя каштоўнасці, фарміруецца нацыянальная самасвядомасць і светапогляд этнафора. Фальклорныя творы Я.Колас разглядаў як сегменты вялікага культурнага тэксту, у якім знітоўваецца ўсё самае лепшае, рацыянальнае і каштоўнае, што назапашана ў этнічнай культуры на працягу стагоддзяў. У мастацкай і публіцыстычнай творчасці Я.Колас звяртаўся да сваіх фальклорных запісаў як да своеасаблівых сродкаў, арыентаваных на семантыка-стылістычныя асаблівасці тэксту, якія акрэслівалі спосабы выкарыстання фальклорных твораў ці іх фрагментаў у новых сувязях.

Значнае месца ў Я.Коласа займаюць казачныя тэксты, у якіх сфакусіравана этыка-эстэтычнае ядро нацыянальнай культуры. Сімволіка з’яўляецца ядром казкі, якое ўяўляе сабой поліфанічны, дыялагічны архетып народа, які мае кожны этнафор на падсвядомым узроўні. У творах пісьменніка знайшоў увасабленне такі жанр вуснай паэтычнай творчасці, як песня. Абраднасць і песеннасць, з уласцівымі ёй вобразнымі мадэлямі асэнсавання свету, мастацкімі і жанравымі асаблівасцямі, Я.Колас лічыў адной з прыкмет культуры. Па яго меркаванні, у беларускіх народных песнях адлюстраваліся ментальныя характарыстыкі народа – талерантнасць, патрыятызм, гуманнасць, прывязанасць і любоў да зямлі, арыентацыя на калектыўнасць і інш.

У коласаўскіх літаратурных тэкстах утрымліваецца таксама значны парэміялагічны пласт, у якім адлюстроўваецца багацце культуры беларусаў. З жанраў малой прозы ў творчасці Я. Коласа знайшлі шырокае адлюстраванне такія адзінкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

малых форм беларускага фальклору, як праклёны (кленічы). У праклёнах, уведзеных пісьменнікам у мастацкія тэксты, выкарыстаны прыём семантычнага паралелізму, характэрнага для беларускай народнай традыцыі. Пісьменнік умела карыстаўся багаццем разнастайных па змесце легенд і паданняў беларускага народа, якія ўвабралі ў сябе выпрацаваныя беларускай народнай культурай стэрэатыпнае бачанне і ацэнкі свету, той ментальны інструментарый, якім карысталася асноўная маса людзей на працягу стагоддзяў. Запазычваючы з іх сюжэты і вобразы, Я.Колас пераасэнсоўваў іх, напаўняў новым гучаннем.

Такім чынам, Я.Колас, уводзячы ў свае творы фрагменты народнай паэзіі і прозы, зыходзіў з разумення ролі этнакультурнай канстанты, якая закладзена ў вуснай народнай творчасці і грунтуецца не на зменлівых станах людзей, а на дамінантных і важнейшых уяўленнях беларусаў, закладзеных у іх свядомасці стагоддзямі. Ім узноўлены важнейшыя сімвалы беларускага фальклору: дабра, зла, жыцця, смерці, прыгажосці, радзімы і інш.

*У раздзеле 3.3* ***“Рэканструкцыя Я.Коласам сімвалічнага зместу артэфактаў матэрыяльнай культуры беларусаў”*** рэпрэзентуюцца спосабы арганізацыі розных сфер паўсядзённага жыцця суб’ектаў беларускай нацыянальнай культуры, якія знайшлі ўвасабленне ў творчасці пісьменніка. Да ўласна этнаграфічных прац можна аднесці такія, як ―Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле”, ―Аб сялянскіх забудовах (вёскі Люсіна, Мінскай губерні, Пінскага павета, Хатыніцкай воласці)”. Яны вызначаюцца разнастайнасцю фактычнага матэрыялу, у іх прыводзяцца дакладныя звесткі аб матэрыяльнай культуры, грамадскім і сялянскім побыце, вераваннях і абрадах беларускіх сялян. Кантэкстуальнае прачытанне іх дазваляе сцвярджаць, што Я.Колас праз этнаграфічны матэрыял адлюстроўваў сацыяльную дынаміку культуры жыццезабеспячэння.

У мастацкіх творах і этнаграфічных працах Я.Коласа даволі часта сустракаюцца замалёўкі інтэр’ера жылля, народнага касцюма, прылад працы, страў і напояў. Яны выкарыстоўваліся пісьменнікам для выяўлення этнічнай самабытнасці матэрыяльнай культуры беларусаў, стварэння этнічнага самавобраза беларуса. Дадзеныя артэфакты ён разумеў  як культурныя тэксты, што ўтрымліваюць у сабе культурны вопыт народа, кадзіруюць, захоўваюць і транслююць яго. З’яўляючыся спецыфічным тэкстам, інтэграванай сістэмай знакаў сімвалічнага характару, яны служылі пісьменніку пэўным ключом да разумення сутнасці народнага жыцця. Разнастайныя артэфакты матэрыяльнай культуры беларусаў выяўляюць у коласаўскіх творах глыбокае семантыка-семіятычнае абагульненне. У іх даволі шырока рэпрэзентавана сістэма матэрыяльных адносін, заснаваных на сімвалічных каштоўнасцях. Этнаграфічным дэталям коласаўскіх твораў уласціва ёмістае сэнсавае напаўненне. Жыллё, інтэр’ер, гаспадарчыя і грамадскія пабудовы, прылады працы, ежа, адзенне падаюцца ў пэўным сацыякультурным кантэксце як своеасаблівы культурны тэкст. Так, хата ўвасабляе ідэю роднага кута, прытулку чалавека. Сімвалічна-рытуальныя функцыі маюць будаўнічыя матэрыялы (дрэва, камень, салома, гліна і інш.). Семіятычнае значэнне ў коласаўскіх тэкстах набываюць дзверы і вокны як элементы дома, якія  былі сімваламі ўваходу і выхаду, умовай для захавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хатай свайго статусу. Я.Колас суадносіў іх з ідэяй праніклівасці, сувязі чалавека з навакольным светам. Усім дзеянням каля дзвярэй надавалася высокая ступень семіятычнасці. У тэкстах пісьменніка занатавана шмат этыкетных і абрадавых дзеянняў каля дзвярэй. Глыбокі сэнс меў інтэр’ер. Выключнае месца ў каляндарна-сямейных абрадах і звычаях беларусаў адводзілася печы, падкрэслівалася яе гендэрная сімволіка. Стол разглядаўся як рытуальна-маркіраваны цэнтр хаты, вакол якога адбываліся асноўныя сямейна-родавыя падзеі. Покуць мела самы высокі абрадавы статус. Адзенне ў Я.Коласа выступае як сістэма знакаў сімвалічнага характару. Ежа, напоі разглядаюцца як своеасаблівы код у структуры нацыянальнай культуры беларусаў, ключ да разумення сутнасці народнага жыцця.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. У творчай спадчыне Я.Коласа выразна выяўляецца сэнсаўтваральная накіраванасць свядомасці пісьменніка на з’явы і працэсы нацыянальнай культуры беларусаў. Менавіта таму творчасць пісьменніка прасякнута этнакультурнай інтэнцыянальнасцю, якая набывае форму мастацка-вобразнага спасціжэння культуры і ўяўляе сабой прастору, дзе выказаны актуальныя для сучаснасці культуралагічныя ідэі.

Пісьменнік імкнуўся асэнсаваць вытокі беларускай нацыянальнай культуры, сутнаць яе феноменаў і з’яў, спасцігнуць яе адметнасць і самабытнасць, месца і ролю беларусаў у сусветным культурным працэсе. Мастацкія і публіцыстычныя творы Я.Коласа напоўнены глыбіннай духоўнасцю, каштоўнасным зместам, вакол якіх фарміруецца этнакультурны масіў яго творчасці. У спадчыне пісьменніка ўвасоблены сімвалы, сэнсы, архетыпы, нормы, каштоўнасці і артэфакты беларускай духоўнай і матэрыяльнай культуры. Выразна акрэсленыя Я.Коласам, яны па-ранейшаму знаходзяцца ў кантэксце надзённых і запатрабаваных пытанняў сёння і адначасова скіраваных ў будучыню [1; 10].

2. У коласаўскай літаратурнай спадчыне скандэсаваны важнейшыя ідэі і змест нацыянальна-культурнага адраджэння, менавіта: развіццё эканамічнага, сацыяльна-палітычнага, культурнага працэса да больш высокіх форм грамадскага быцця пасля працяглага перыяду заняпаду; фарміраванне самасвядомасці беларусаў; шырокае выкарыстанне беларускай мовы; стварэнне нацыянальнай сістэмы адукацыі і навукі; развіццё беларускай літаратуры, нацыянальнага тэатра, музычнага і выяўленчага мастацтва, перыядычнага друку; вывучэнне гісторыі беларускага народа; выхаванне нацыянальнай інтэлігенцыі; трансляцыя культуры беларусаў у сусветную прастору. Названыя праграмныя ідэі з’яўляюцца важнейшымі складнікамі зместу этнакультурнай інтэнцыянальнасці ў творчасці Я.Коласа, якія не страцілі актуальнасці для сацыякультурнага развіцця сучаснага грамадства.

Культурная памяць як адна з найбольш фундаментальных катэгорый культуралогіі ў творчай спадчыне пісьменніка набывае таксама грунтоўны інтэнцыянальны змест. Я.Колас вызначыў сутнасць і стратэгіі культурнай памяці (―абгрунтоўваючую” і ―кантрапрэзентную”); паказаў найбольш радыкальныя разрывы культурна-гістарычнага развіцця беларускага этнасу, якія трактуюцца ў сучасных наратывах як культурная траўма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Без культурнай памяці, па меркаванні Я.Коласа, немагчыма ўявіць развіццё беларускага грамадства. Культурная памяць з’яўляецца звяном, якое злучае мінулае грамадства з яго сучасным і арыентуе яго ў будучае, адлюстроўвае задачы, сугучныя зместу дзяржаўнага і культурнага адраджэння. На думку пісьменніка, культурная памяць уключае ў сябе фрагментарныя звесткі аб працэсах і выніках культурнага развіцця беларускага грамадства, а таксама інтэрпрэтацыю артэфактаў культуры, сацыякультурных працэсаў і з’яў, якія сталі аб’ектам сацыяльнай рэальнасці.

У выніку даследавання мы прыйшлі да высновы, што Я.Колас адмаўляў “абгрунтоўваючую” стратэгію культурнай памяці, якая ўспрымае мінулае як заканамерную з’яву, прымае неабходнасць існуючага парадку рэчаў, заклікае да пакоры і прагматызму. Ён быў прыхільнікам “контрапрэзентнай” стратэгіі, якая прасякнута адчуваннем недасканаласці і неправамернасці сацыякультурнай сітуацыі і арыентавала беларусаў на актыўную дзейнасць па дэтраўматызацыі і ўзнаўленню цэласнасці ідэнтычнасці беларускай сацыяльнай супольнасці і яе культуры [5; 9; 11].

3. Культуратворчасць Я.Коласа выконвала важную сацыяльную і адраджэнскую місію, была накіравана на вырашэнне складаных грамадска-культурных і асветніцка-адукацыйных задач. Справу развіцця беларускай культуры пісьменнік звязваў з такім базавым пунктам сваёй праграмы культурнага адраджэння, як фарміраванне ў суб’екта беларускай культуры нацыянальнай свядомасці. Важнейшую ролю ў рэалізацыі гэтай ідэі пісьменнік адводзіў працэсу інкультурацыі, інтэнцыянальны змест якога увасоблены ў яго дыдактычных працах, публіцыстычных і мастацкіх творах. Ім вызначаны эмпірычна выверанвя дзейсныя сродкі (беларуская мова і літаратура, адукацыя, этнічная культура, мастацтва) далучэння індывіда да нацыянальнай культуры беларусаў і засваення ім каштоўнасцей, норм, ідэалаў і патэрнаў паводзін, выпрацаваных у працэсе культурагенезу.

У аснову коласаўскай рэфлексіі пакладзены прынцып усебаковага развіцця беларускай мовы – як вуснай, так і пісьмовай. Пісьменнік надаваў роднай мове выключную ролю ў фарміраванні этнічнага светапогляду, эстэтычнага густу, крэатыўнасці, развіцця мыслення асобы. Я.Коласам вызначана роля і месца агентаў інкультурацыі: бацькоў, сваякоў, педагогаў, навукоўцаў, дзеячаў культуры і мастацтва. Пісьменнік надаваў вялікую ўвагу культурна-асветніцкай дзейнасці сацыяльных інстытутаў: сям’і, навучальных устаноў, музеяў, бібліятэк, тэатраў, сродкаў масавай інфармацыі.

Пісьменнікам грунтоўна ўвасоблены спосабы перадачы культурнага досведу маладому пакаленню: вертыкальная, гарызантальная і непрамая трансмісія. Гэтыя ідэі, выказаныя Я.Коласам, сугучны важнейшым палажэнням сучаснай культуралагічнай канцэпцыі інкультурацыі асобы [3; 7; 8; 13].

4. Вобраз суб’екта нацыянальнай культуры беларусаў атаясамліваўся ў Я.Коласа ў першую чаргу з сялянствам, а таксама выхадцамі з народа – інтэлігенцыяй. Таму іх культуры як асобныя цэласныя ўтварэнні ўнутры нацыянальнай культуры знайшлі грунтоўнае адлюстраванне ў творчай спадчыне пісьменніка.

Сялянская культура ўсведамлялася Я.Коласам як сацыяльны і ментальны падмурак беларускай нацыі. Да важнейшых элементаў сялянскай культуры пісьменнік адносіў: міфапаэтычнае, рэлігійна-сакральнае светаўспрыманне,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

каштоўнасці (праца, сям'я, патрыятызм, свабода, цярплівасць, дабрата, альтруізм), гаспадарча-вытворчую дзейнасць і абумоўлены ёю побыт і лад жыцця, традыцыйную сімволіку жылля, адзення, ежы, рытуалізаванасць жыцця і сувязь яго з каляндарным цыклам.

Прадметам рэфлексіі пісьменніка з'яўляюцца таксама дамінантныя кампаненты культуры інтэлігенцыі: рацыянальны светапогляд, каштоўнасці (веды, самаахвяраванне, свабода, нацыянальная незалежнасць, сумленне, абавязак, справядлівасць), грамадска-карысная і палітычная дзейнасць (асвета народа, барацьба з сацыяльным злом, удасканаленне грамадства); спецыфічны стыль жыцця і паводзін.

Культуры сялянства і інтэлігенцыі прадстаўлены ў тэкстах мастацкіх і публіцыстычных твораў пісьменніка як семіётыка-семантычная рэчаіснасць са сваёй знакавай сістэмай, сэнсамі, якімі надзяляюцца розныя артэфакты культуры (святочныя стравы, інтэр'ер хаты, адзенне і інш.). Семіятычнай падсістэмай з'яўляюцца адносіны паміж носьбітамі культуры на аснове падзяляемых імі каштоўнасцей, норм, ідэалаў. Спецыфіцыруе інтэлігенцыю і сялянства мова, у якой закадзіраваны значэнні, выпрацаваныя носьбітамі гэтых культур [2; 4; 10].

5. Этнічная аперцэпцыя з'яў і працэсаў культуры ў Я.Коласа фарміравалася пад уплывам народнай культуры беларусаў, вызначалася светапоглядам і агульнай інтэнцыяй, мастацкай інтуіцыяй народа. Своеасаблівымі кагнітыўнымі ўзорамі, на якіх заснавана коласаўская аперцэпцыя, з'яўляюцца этнакультурныя архетыпы, якія выступаюць у якасці аб'екта рэфлексіі пісьменніка. З дапамогай прасторавых архетыповых вобразаў Сонца, Зямлі, Вады, Дрэва, Лесу, Балота, Агню, Дарогі Я.Колас адлюстроўваў розныя бакі культурнага і грамадскага жыцця беларусаў. Пісьменнік рэканструяваў старажытныя сэнсы названых і іншых этнакультурных архетыпаў і адначасова зрабіў асабіста аўтарскае напаўненне названых вобразаў-архетыпаў. У антрапаморфным архетыповым вобразе Старца скандэнсаваны асноўныя этнічныя рысы беларуса – мудрасць, памяркоўнасць, кемлівасць, разважлівасць, асцярожнасць. Архетып Музыкі ў мастацкіх тэкстах Я.Коласа асацыіруецца з ідэалам нацыянальна-культурнага адраджэння, сімвалічным увасабленнем творчай інтэлігенцыі. Музыка выступае носьбітам народных ідэалаў, народнага сумлення, змагаром за шчасце народа. У гэтым вобразе выяўляюцца пэўныя ідэі канцэпцыі мастацтва, згодна з якой сапраўднае мастацтва ствараецца свабоднай таленавітай асобай і служыць народу.

У мастацкай і публіцыстычнай творчасці Я.Коласа назіраецца своеасаблівая кантамінацыя элементаў прафесійнай літаратуры і вуснай народнай творчасці. Вобразы апрацаваных сюжэтаў фальклорных твораў (казак, паданняў, легенд, песень і інш.) набывалі ў творах пісьменніка складанае сімвалічнае значэнне (жыцця, смерці, дабра, зла, барацьбы, радзімы, іншага свету і інш.). У іх увасоблена шырокае кола з'яў і ўяўленняў аб навакольнай рэчаіснасці і ўнутраным духоўным свеце беларусаў.

У творчай спадчыне Я.Коласа даволі шырока рэпрэзентаваны матэрыяльныя формы паўсядзённай культуры беларусаў. Вобразам жылля, яго інтэр'ера, гаспадарчых і грамадскіх пабудоў, прылад працы, ежы, адзення і іншым артэфактам матэрыяльнай культуры, адлюстраваным у коласаўскіх творах, уласціва ёмістае сэнсавае напаўненне. Яны падаюцца пісьменнікам у пэўным сацыякультурным кантэксце, як своеасаблівы культурны тэкст [1; 6; 12; 14].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Матэрыялы і вынікі дысертацыйнага даследавання выкарыстаны ў навучальным і выхаваўчым працэсе УА —Маладзечанскі дзяржаўны політэхнічны каледж”, УА —Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, а таксама ў якасці метадалагічнай базы  пры распрацоўцы і ажыццяўленні навукова-педагагічнага праекта —Сацыякультурны вобраз беларускай карчмы” (аб чым сведчаць акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 19.11.2010 г., 16.12.2011 г., 12.04.2012 г.).

Вынікі  даследавання могуць быць выкарыстаны: пры культуралагічным аналізе літаратурных тэкстаў іншых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў; у якасці тэарэтыка-метадалагічнай асновы вучэбных курсаў для студэнтаў ВНУ: —Тэорыя і гісторыя культуры”, —Аксіялогія культуры”, —Лінгвакультуралогія”, —Беларуская культура XX–XXI стст.” і інш.; у музейна-экспазіцыйнай дзейнасці устаноў, якія займаюцца трансляцыяй і рэпрэзентацыяй культуратворчасці  і літаратурнай творчасці пісьменніка, а таксама служыць дадатковай прафесійнай і навукова-асветніцкай інфармацыяй для супрацоўнікаў бібліятэк, турыстычных арганізацый, рэдакцый літаратурных газет і часопісаў; у ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце дзяржаўных і грамадскіх сацыякультурных устаноў.

Асноўныя ідэі і высновы дысертацыі будуць садзейнічаць больш глыбокаму ўсведамленню ролі і месца творчай спадчыны Я.Коласа ў практыцы сацыякультурных пераўтварэнняў, якія адбываюцца ў сучасным беларускім грамадстве і паслужаць практычнай задачы сучаснага культурнага будаўніцтва, у якім роля літаратуры як тэкста культуры застаецца вельмі значнай і прадуктыўнай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

## Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных часопісах

1. Вярбіцкая, В.І. Культуралагічная інтэнцыя творчай спадчыны Якуба Коласа / В.І. Вярбіцкая // Род. слова. – 2010. – № 11. – С. 95–99.

2. Вярбіцкая, В.І. Каштоўнасці сацыяльных субкультур у творчай спадчыне Якуба Коласа / В.І. Вярбіцкая // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2011. – № 1. – С. 46–52.

3. Вярбіцкая, В.І. Аперцэпцыя сацыялізацыі асобы Якубам Коласам: культуралагічны аспект / В.І. Вярбіцкая // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2011. – №2 – С. 87–92.

4. Вярбіцкая, В.І. Эпічны чалавек і яго карціна свету ў творчай спадчыне Якуба Коласа / В.І. Вярбіцкая // Искусство и культура. – 2011. – № 3. – С. 66–71.

5. Вярбіцкая, В.І. Мнеманічная аксіялогія культуры ў творчай спадчыне Якуба Коласа / В.І. Вярбіцкая // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. E, Педагогические науки. – 2012. – № 7. – С. 109–113.

## Артыкулы ў навуковых зборніках

6. Вярбіцкая, В.І. Адлюстраванне народнай казкі ў творчасці Якуба Коласа / В.І.Вярбіцкая // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманна : зб. навук. прац удзельнікаў IV Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29–30 крас. 2010 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М.А. Мажэйка (старш.), В.В.Калацэй, С.К. Канановіч. – Мінск, 2010. – С. 117–119.

## Матэрыялы навуковых канферэнцый

7. Вярбіцкая, В.І. Інверсія культурна-адукацыйнай дзейнасці дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа / В.І. Вярбіцкая // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею : матэрыялы навук. канф., Віцебск, 30–31 кастр. 2008г. / Віцеб. абл. краязн. музей ; рэдкал.: Г.У. Савіцкі, В.А. Шышанаў, А.І.Лагунова. – Мінск, 2009. – С. 325–329.

8. Вербицкая, О.И. Сохранение природных ландшафтов мемориальных усадеб Якуба Коласа / О.И. Вербицкая // Культура, наука, образование в современном мире : материалы IV Междунар. науч. конф. / Гродн. гос. аграр. ун-т ; редкол.: Л.Л.Мельникова [и др.]. – Гродно, 2009. – С. 287–293.

9. Вербицкая, О.И. Проблемы сохранения и использования мемориальных усадеб народного поэта Беларуси Якуба Коласа / О.И. Вербицкая // Зберігання історико-культурної спадщини. Наука та практика : наук. доп. VII Міжнар. наук.-практ. конф., Київ, 22–24 верес. 2009 р. / Нац. н.-д. реставрац. центрі України. – Київ, 2009. – С. 32–37.

10. Вярбіцкая, В.І. Увасабленне народнай культуры беларусаў у творчасці Якуба Коласа / В.І. Вярбіцкая // Другія Тышкевіцкія чытанні : матэрыялы чытанняў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лагойск, 15 кастр. 2009 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: А.І. Смолік (адк. рэд.) [ і інш.]. – Мінск, 2009. – С. 98–103.

11. Вярбіцкая, В.І. Увасабленне традыцый рускай і ўкраінскай літаратуры ў творчасці Якуба Коласа / В.І. Вярбіцкая // Народы, культуры и социальные процессы на пограничье : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Гродно, 22–23 февр. 2010 г. / Гродн. гос. ун-т ; редкол.: Е.М. Бабосов (отв. ред.) [и др.]. – Гродно, 2010. – С. 277–279.

12. Вярбіцкая, В.І. Увасабленне архетыпавага вобраза музыкі ў творчасці Якуба Коласа / В.І. Вярбіцкая // Актуальные проблемы мировой художественной культуры : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. памяти проф. У.Д. Розенфельда, Гродно, 25–26 марта 2010 г. : в 2 ч. / Гродн. гос. ун-т ; редкол.: А.П. Богустав (отв. ред.) [и др.]. – Гродно, 2011. – Ч. 1. – С. 75–81.

13. Вярбіцкая, В.І. Пытанні выхавання і адукацыі ў творчасці Якуба Коласа / В.І Вярбіцкая // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 35-годдзю БДУКМ, Мінск, 3 снеж. 2010 г. : у 2 т. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М.А. Мажэйка (адк. рэд.)[і інш.]. – Мінск, 2011. – Т.2. – С. 198–201.

14. Вярбіцкая, В.І. Універсальная ідэя народнай песні і яе ўвасабленне ў творчасці Якуба Коласа / В.І. Вярбіцкая // Фальклор і сучасная культура : матэрыялы III Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 21–22 крас. 2011 г. : у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: І.С. Роўда [і інш.]. – Мінск, 2011. – Ч. 1. – С. 36–38.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЭЗЮМЭ

**Вярбіцкая Вольга Іванаўна**

## ЭТНАКУЛЬТУРНАЯ ІНТЭНЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ У ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ ЯКУБА КОЛАСА

Ключавыя словы: артэфакт, інкультурацыя, культурная памяць, нацыянальная культура беларусаў, нацыянальна-культурнае адраджэнне, сімвал, сэнс, тэкст культуры, фальклор, этнакультурная інтэнцыянальнасць, этнакультурны архетып, этнас, этнічная культура, этнічная аперцэпцыя.

Мэта даследавання – выяўленне ў творчасці Я.Коласа этнакультурнай інтэнцыянальнасці як крыніцы сэнсаў і ідэй, актуальных для развіцця сучаснага беларускага грамадства.

Метады даследавання. Тэарэтычную базу даследавання складаюць канцэптуальныя палажэнні фенаменалогіі культуры, герменеўтыкі, семіётыкі, структуралізму, постструктуралізму, культурнага рэлятывізму, псіхааналізу. Выкарыстоўваліся наступныя метады: гісторыка-культурнай рэканструкцыі, генетычны, біяграфічны, кантэнт-аналіз, кампаратыўны.

Атрыманыя вынікі і іх навізна. Упершыню ў беларускай культуралогіі творчая спадчына Я.Коласа даследавана як тэкст культуры, з пазіцыі комплекснага падыходу; вызначаны змястоўная для культуратворчай дзейнасці пісьменніка праграма нацыянальна-культурнага адраджэння, сутнасць і змест культурнай памяці, яе ―кантрапрэзентная” стратэгія для пераадолення культурнай траўмы беларускага этнасу; выяўлены ідэі, сугучныя канцэпцыі інкультурацыі, дамінантныя кампаненты культур інтэлігенцыі і сялянства, рэпрэзентатыўныя аб’екты матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

Рэкамендацыі па выкарыстанні. Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны падчас культуралагічнага аналізу літаратурных тэкстаў іншых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў; у якасці тэарэтыка-метадалагічнай асновы вучэбных курсаў для студэнтаў ВНУ: ―Тэорыя і гісторыя культуры”, ―Аксіялогія культуры”, ―Беларуская культура ХХ–ХХІ стст.” і інш.; у ідэалагічнай, выхаваўчай, а таксама музейна-экспазіцыйнай дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх сацыякультурных устаноў.

Сфера выкарыстання: культуралогія, лінгвакультуралогія, гісторыя айчыннай культуры, фенаменалогія культуры, аксіялогія культуры.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

## ВЕРБИЦКАЯ ОЛЬГА ИВАНОВНА

## ЭТНОКУЛЬТУРНАЯ ИНТЕНЦИОНАЛЬНОСТЬ В ТВОРЧЕСКОМ НАСЛЕДИИ ЯКУБА КОЛАСА

Ключевые слова: артефакт, инкультурация, культурная память, национальная культура белорусов, национально-культурное возрождение, символ, смысл, текст культуры, фольклор, этническая апперцепция, этническая культура, этнокультурная интенциональность, этнокультурный архетип, этнос.

Цель исследования – выявление в творчестве Я.Коласа этнокультурной интенциональности как источника смыслов и идей, актуальных для развития современного белорусского общества.

Методы исследования. Теоретическую базу исследования составляют концептуальные положения феноменологии культуры, герменевтики, семиотики, структурализма, постструктурализма, культурного релятивизма, психоанализа. Использовались следующие методы: историко-культурной реконструкции, генетический, биографический, контент-анализ, компаративный.

Полученные результаты и их новизна. Впервые в белорусской культурологии творческое наследие Я.Коласа исследовано как текст культуры, с позиции комплексного подхода; определены содержательная для культуротворческой деятельности писателя программа национально-культурного возрождения, сущность и содержание культурной памяти, ее "контрпрезентная" стратегия для преодоления культурной травмы белорусского этноса; выявлены идеи, созвучные концепции инкультурации, доминантные компоненты культур интеллигенции и крестьянства, репрезентативные объекты духовной и материальной культуры белорусов.

Рекомендации по использованию. Результаты диссертационного исследования могут быть использованы при культурологическом анализе литературных текстов других белорусских писателей и поэтов; в качестве теоретико-методологической основы учебных курсов для студентов вузов: ―Теория и история культуры”, ―Аксиология культуры”, ―Белорусская культура XX–XXI веков” и др.; в идеологической, воспитательной, а также музейно-экспозиционной деятельности государственных и общественных социокультурных учреждений.

Область применения: культурология, лингвокультурология, история отечественной культуры, феноменология культуры, аксиология культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## SUMMARY

**Verbitskaya Olga Ivanovna**

## ETHNOCULTURAL INTENTIONALITY IN THE CREATIVE HERITAGE OF YAKUB KOLOS

Keywords: artifact, inculturation, cultural memory, the Belarusian national culture, cultural revival, symbol, meaning, the text of culture, folklore, ethnic apertseptsiya, ethnic culture, ethnic and cultural intentionality, ethnic and cultural archetype, ethnicity.

The purpose of research – detection in the creative heritage of Yakub Kolas of ethnic and cultural intentionality as a source of meanings and ideas for the social and cultural development of Belarusian society.

Research methods. Theoretical basis of research is based on the conceptual statements of phenomenology of culture, hermeneutics, semiotics, structuralism, postsructuralism, cultural relativism, psychoanalysis. The following methods were used: historical and cultural reconstruction, genetic, biographical, content analysis, comparative.

Results and scientific innovation. For the first time in the Belarusian cultural studies creative heritage of Yakub Kolas is regarded as hypertext of national culture of Belarusians, substantial program of national and cultural renaissance for writer's cultural activity is revealed, the nature and content of cultural memory and the use of optimistic "contr representative" strategy in order to overcome cultural trauma of Belarusian nation is shown, the idea similar to the theory of inculturation is found, the dominant component of the culture of the upper classes and the peasantry is identified.

Recommendations for use. Results of the dissertation research can be used for cultural analysis of literary texts of other Belarusian writers and poets; as a theoretical and methodological basis of training courses for the students: "The theory and history of culture", "Axiology of culture", "Belarusian culture of the XX–XXI centuries" and etc.; in the ideological, educational and museum work of state and non-governmental social and culture organizations.

Sphere of application: cultural studies, linguistics, history of Belarusian culture, phenomenology of culture, axiology of culture.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

**Вярбіцкая Вольга Іванаўна**

**Этнакультурная інтэнцыянальнасць**
**у творчай спадчыне Якуба Коласа**

**Аўтарэферат**

дысертацыі на саісканне
вучонай ступені кандыдата культуралогіі

Падпісана ў друк 26.12.2012. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк.1,73. Ул.-выд. арк. 1,63. Тыраж 60 экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ